Belarus - Духоўны Змаганьнем Малітва - SW Intro Scriptures

Рымлянаў 10:17 Таму вера, ад слуханьня, а слуханьне, праз слова Божае.
Лукі 11:1 І сталася, як Ён у адным месцы маліўся, калі перастаў, адзін з вучняў Ягоных сказаў Яму: Госпадзе! Навучы нас маліцца, як і Ян навучыў вучняў сваіх. Лукі 17:5 І сказалі апосталы Госпаду: Дадай нам веры.
1 Цімафея 2:1-4 Дык перш за ўсё прашу ўзносіць просьбы, малітвы, умольваньні і падзякі за ўсіх людзей, 2. за валадароў і за ўсіх, хто пры ўладзе, каб весьці нам жыцьцё ціхае і спакойнае ў-ва ўсякай пабожнасьці і сумленнасьці, 3. бо гэта добра і прыемна перад Збаўцам нашым Богам, 4. Які хоча, каб усе людзі былі збаўленыя і прыйшлі да пазнаньня праўды.
Лукі 22:31 І сказаў Госпад: Сымоне, Сымоне! Вось, шатан зажадаў прасейваць вас, як пшаніцу,
Захарыя 3:1,2 - Юды 1:9 Міхал арханёл, калі гаварыў з д'яблам, спрачаючыся за цела Майсея, не адважыўся вынесьці блюзьнерскага прысуду, але сказаў: Няхай забароніць табе Госпад.
Эфэсцаў 6:10-12 Нарэшце, браты мае, умацоўвайцеся ў Госпадзе і ва ўладзе магутнасьці Яго. 11. Апраніцеся ў-ва ўсю зброю Божую, каб маглі ўстаяць супраць хітрыкаў д'ябла, 12. бо нашая барацьба ня супраць крыві і цела, але супраць начальстваў, супраць уладаў, супраць сусьветных дзяржаўцаў цемры гэтага веку, супраць духаў зласьлівасьці ў нябёсах.
Эфэсцаў 6:13-17 Дзеля гэтага вазьміце ўсю зброю Божую, каб вы маглі супрацьстаць у дзень злы і, усё зрабіўшы, застацца стаяць. 14. Дык станьце, падперазаўшы паясьніцу вашую праўдаю, і апрануўшы панцыр праведнасьці, 15. і абуўшы ногі ў гатовасьць дабравесьціць супакой, 16. і па-над усё ўзяўшы шчыт веры, якім зможаце затушыць усе распаленыя стрэлы злога. 17. І шалом збаўленьня прыйміце, і меч Духа, які ёсьць слова Божае.
Гебраяў 4:12 Бо слова Божае жывое і дзейснае, і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны, і працінае аж да разьдзяленьня душы і духа, суставаў і шпіку, і судзіць думкі і намеры сэрца. 1 Самуэля 17:45-47 - Давід & Галіяф
Лукі 4:8 І, адказваючы, сказаў яму Ісус: Адыйдзі ад Мяне, шатан! Бо напісана: Госпаду, Богу твайму, пакланяйся і Яму аднаму служы.
Эфэсцаў 6:18 Усякаю малітваю і просьбаю маліцеся ў-ва ўсякі час у Духу, і ва ўсім гэтым чувайце з усёй настойлівасьцю і просьбамі за ўсіх сьвятых
Лукі 10:17-20 Семдзесят жа вярнуліся з радасьцю, кажучы: Госпадзе! І дэманы падпарадкоўваюцца нам у імя Тваё. 18. Ён жа сказаў ім: Я бачыў шатана, які ўпаў з неба, як бліскавіца. 19. Вось, Я даю вам уладу наступ-аць на зьмеяў і скарпіёнаў, і на ўсю сілу варожую, і нішто не пашкодзіць вам. 20. Аднак жа з таго ня радуйцеся, што духі вам падпарадкоўваюцца; але радуйцеся з таго, што імёны вашыя запісаны ў небе.
2 Карыньцянаў 10:3-5 Бо мы, ходзячы ў целе, не паводле цела змагаемся, 4. бо зброя змаганьня нашага не цялесная, але магутная ад Бога на руйнаваньне цьвярдыняў. 5. [Мы змагаемся,] руйнуючы думкі і ўсякае

ўзьвялічваньне, якія паднімаюцца супраць веданьня Бога, і беручы ў палон усякую думку на паслухмянасьць Хрысту,

Мацьвея 16:19 І дам табе ключы Валадарства Нябеснага, і што зьвяжаш на зямлі, тое будзе зьвязана ў небе; і што разьвяжаш на зямлі, тое будзе разьвязана ў небе. 2 Цімафея 1:7 бо даў нам Бог ня духа палахлівасьці, але сілы, і любові, і цьвярозага мысьленьня.

Мацьвея 12:28,29 А калі Я Духам Божым выганяю дэманаў, значыцца, дасягнула вас Валадарства Божае. 29. Або як можа хто ўвайсьці ў дом асілка і абрабаваць рэчы ягоныя, калі раней ня зьвяжа асілка, і тады абрабуе дом ягоны.

Эфэсцаў 1:13 У Ім і вы, пачуўшы слова праўды, Эвангельле вашага збаўленьня, і паверыўшы ў Яго, запячатаныя абяцаным Духам Сьвятым,

Дэеі 19:6 І, як усклаў Павал рукі на іх, зыйшоў на іх Дух Сьвяты, і гаварылі мовамі, і прарочылі.

Марка 16:15-18 І сказаў ім: «Ідзіце на ўвесь сьвет і абвяшчайце Эвангельле ўсяму стварэньню. 16. Хто паверыць і ахрысьціцца, будзе збаўлены, а хто не паверыць, будзе асуджаны. 17. А тым, што паверацъ, будуць такія знакі: у імя Маё выганяць будуць дэманаў, новымі мовамі гаварыць будуць, 18. зьмеяў браць будуць, і калі што сьмяротнае вып'юць, не пашкодзіць ім, на нямоглых рукі ўскладуць, і яны будуць здаровыя.

1 Яна 1:9 Калі прызнаем грахі нашыя, Ён верны і праведны, каб дараваць нам грахі і ачысьціць нас ад усякае няправеднасьці.

Псальмаў 109:17 - Якуба 3:10 з тых самых вуснаў выходзіць дабраслаўленьне і праклён. Не павінна быць гэтак, браты мае.

Судзьдзяў 16:16 - 2 Пятра 2:7,8 а праведнага Лота, крыўджанага бессаромным ладам жыцьця беззаконьнікаў, выбавіў, 8. бо гэты праведнік, жывучы між імі, з дня ў дзень мучыў праведную душу [сваю], бачачы і чуючы справы беззаконныя,

Эфэсцаў 4:26 Гневайцеся, ды не грашыце: няхай сонца не заходзіць у гневе вашым;

Рымлянаў 14:12 Дык таму кожны з нас за сябе дасьць справаздачу Богу.

1 Яна 2:23 Усякі, хто адракаецца Сына, ня мае і Айца; хто вызнае Сына, мае і Айца. Яна 14:6 Кажа яму Ісус: Я ёсьць шлях, і праўда, і жыцьцё. Ніхто не прыходзіць да Айца, калі не праз Мяне.

Мацьвея 11:28-30 Прыйдзіце да Мяне ўсе спрацаваныя і абцяжараныя, і Я дам вам супачынак. 29. Вазьміце ярмо Маё на сябе і навучыцеся ад Мяне, бо Я — ціхі і пакорнага сэрца, і знойдзеце супачынак душам вашым. 30. Бо ярмо Маё добрае, і цяжар Мой лёгкі.

2 Карыньцянаў 6:2 Бо Ён кажа: У час прыемны Я выслухаў цябе і ў дзень збаўленьня дапамог табе. Вось, цяпер час адпаведны, вось, цяпер дзень збаўленьня! Зыход 20:5 - sin cursed to 3 & 4 generations

Рымлянаў 10:13 Бо кожны, хто прызаве імя Госпада, будзе збаўлены.